УДК 882.6(091)

# Сацыяльна-гістарычны аспект у паэтычнай спадчыне У. Дубоўкі

**Г.П. Харошка**

*На аснове вершаў і паэмы У. Дубоўкі "Крычаўская спакуса" раскрываецца сацыяльны і гістарычны аспект мінулага Беларусі і яе народа. Зварот паэта да сацыяльнай і гістарычнай тэматыкі быў абумоўлены цікавасцю пісьменніка да мінулага народа, яго нягаснага клопату да будучых пакаленняў. Творы У. Дубоўкі ілюструюць не толькі падзеі далёкага мінулага, але паказваюць цяжкае жыццё продкаў, сцвярджаюць іх найвялікшую прагу да жыцця і свабоды, славяць працоўнага чалавека, яго мужнасць і нескаронасць. Разам з тым у творах аўтара паказваюцца жыццёвыя рэаліі, у якіх найбольш глыбока раскрываецца веліч і хараство беларуса, цэласнасць і сіла яго духу і характару.*

*Высокамастацкая паэзія У. Дубоўкі ўважліва ўзіраецца ў мінулае, каб вынесці з яго зерне гістарычнай праўды.*

Уладзімір Дубоўка – рэдкі па таленце чалавек, творца, які разам з Я. Купалам, Я. Коласам, М. Гарэцкім, К. Чорным, К. Крапівой, М. Зарэцкім, М. Лынньковым закладваў асновы беларускай савецкай літаратуры. Па прыродзе таленту У. Дубоўка – лірык, паэт-рамантык, які імкнуўся перадаць самыя тонкія зрухі ў чалавечай душы, раскрыць глыбока індывідуальныя і складаныя перажыванні чалавека.

Патрэбна сказаць, што наша крытыка дастаткова грунтоўна і праніклівы дала вытлумачэнні многіх наватарскіх пошукаў і адкрыццяў паэта, у тым ліку і яго спробу з'яднання эпічнага і лірычнага пачаткаў у творах. У сваёй паэтычнай практыцы аўтар часта эксперыментаваў як у лірыцы, так і эпасе, пераадольваў пераймальніцтва, з вялікай увагай ставячыся да індывідуальнага, суб'ектыўнага перажывання, спалучаючы паказ такога перажывання з пошукам нечаканых асацыятыўных вобразаў. Як справядліва падкрэслівае Р. Бярозкін, "адна з заслуг У. Дубоўкі ў тым і заключаецца, што ён шырэй і больш грунтоўна, чым многія паэты, яго паплечнікі, ставіў і вырашаў пытанні паэтычнай культуры, мастацкай дасканаласці твораў" [1, с. 145]. Сапраўды, У. Дубоўка быў паэтам вялікага прыроднага таленту з глыбокай народнай мудрасцю светаразумення. Яго творы адыгралі ў свой час (асабліва ў 20-я гады XX ст.) вялікую ролю ў літаратурным працэсе. Яны аказаліся ўстойлівымі перад няўмольным судом наступных пакаленняў і задавальняюць патрабавальны мастацкі густ нашых сучаснікаў. Нездарма, па словах Я. Пушчы, вершы паэта захапляюць класічнасцю свайго мастацкага ўбору, што мала ў каго сустракаем у сучасных паэтаў не толькі Беларусі, але і Расіі і Украіны.

У. Дубоўка быў нераўнадушнай асобай не толькі да літаратуры, але і да культурнай спадчыны, да гістарычнага мінулага сваёй Радзімы і яе народа. Мастацкія прынцыпы паказу чалавека ў творчасці У. Дубоўкі абумоўлены гістарычнымі

поглядамі. Паэт самым рашучым чынам паўставаў супраць ілжывага асвятлення гісторыі беларускага народа як народа адсталага, бязвольнага, няздольнага абараніць сваю чалавечую годнасць. Асабліва гэтая негатыўная тэндэнцыя склалася ў 20-х гадах мінулага стагоддзя. Такі недавер да гістарычнай памяці беларускага народа паралізаваў жывую цікавасць пісьменнікаў да мінулага сваёй Радзімы. Творы аб гістарычнай даўнасці атрымлівалі адмоўныя ацэнкі накшталт наступных: "Часам робяцца спробы ператварыць буржуазна-нацыяналістычнага "героя" ў героя-змагара за нашы дні, за нашы ідэі" (фільм "Кастусь Каліноўскі" і некаторыя творы аб ім...) [2, с. 68]. Або: "Не менш паказальным у гэтым напрамку з'яўляецца пастаноўка ў БДТ-1 п'ес "Скарына – сын з Полацка" М. Грамыкі, "Кастусь Каліноўскі" А. Міраповіча, "Вір" А. Рамановіча, якія скоўвалі БДТ-1 у замкнутае кола правінцыяльнага тэатра, не давалі яму магчымасці вырасці ў высокамастацкую адзінку" [2, с. 36].

Усім добра вядома, што нічога не існуе вечнага. Так ці інакш, але калі-небудзь усе падзеі адыдуць у глыбіню часоў і ператворацца ў гісторыю. Здараецца так, што некаторыя падзеі прымушаюць людзей свядома парушаць усе сувязі з пройдзеным этапам жыцця ці, наадварот, ганарыцца сваім мінулым. Становіцца відавочным, што У. Дубоўка быў не з тых творцаў, хто парываў з мінулым, ён выражаў самаадданую любоў да Беларусі, звязаўшы свой лёс з гісторыяй, якая здавалася яму вялікай каштоўнасцю. У адрозненне ад іншых "знаўцаў" культуры і літаратуры У. Дубоўка быў дастаткова дасведчаным чалавекам, каб з павагай гаварыць пра сапраўдныя старонкі нацыянальнай гісторыі. Тут цалкам можна пагадзіцца з крытыкам Ірынай Багдановіч, якая сцвярджае, што "У. Дубоўка – чалавек незвычайнай эрудыцыі, высокай мастацкай культуры, тонкага густу, вялікага жыццёвага і творчага вопыту" [3, с. 208], які глыбока цаніў і шанаваў тое, што пакінулі нам у спадчыну нашы продкі. Зварот да гістарычнай тэматыкі з боку пісьменніка быў абумоўлены цікавасцю да мінулага свайго народа, яго неацэннай увагі да будучых пакаленняў. У сваіх творах пісьменнік імкнуўся паказаць рэальныя сацыяльна-гістарычныя падзеі, раскрыць гераічныя характары беларусаў, якія сваёй сутнасцю палемічна накіраваны супраць недружалюбцаў нацыянальнай гісторыі. Аўтар ніколі станоўча не адносіўся да тых, хто імкнуўся "схаваць" праўду, падаць недакладныя, скажоныя звесткі. Увядзенне сапраўдных гістарычных імёнаў у свае творы расцэньвалася паэтам як сур'ёзнасць намераў і смеласць падыходу ў вырашэнні набалелых праблем мінулага. Паэт даволі шырока ў сваёй творчасці звяртаўся да гісторыі не толькі сваёй Радзімы, але і іншых народаў. Дз. Бугаёў падкрэслівае, што "шырока прадстаўлены ў паэтычных творах У. Дубоўкі розныя гістарычныя імёны і назвы ад добра вядомай Клеапатры да экзатычнай кітайскай дзяўчыны Ван-Чыоацзюнь" [4, с. 8]. Адзін з вершаў У. Дубоўкі так і называецца – "Пачынаецца з гісторыі", у ім гаворыцца, што "спадчына чарнасоценнага цемрашалу ўрасла ў беларускія землі глыбока і востра" [5, с. 89]. Сапраўды, у гісторыі мы бачым пачатак усяго таго, што нас хвалюе сёння, – будучыню. Гісторыя накладае адбітак на жыццё будучых пакаленняў, яна быццам прагназуе падзеі новага стагоддзя. Крыніцу недахопаў ці вартасцяў сучаснасці трэба шукаць на старонках мінулага, бо нічога не ўзнікае выпадкова, неспадзявана і спантанна, а калі падасца, што гэта так, патрэбна ўважліва прасачыць за ходам падзей, і мы ўбачым, што яны вядуць нас у далёкае

мінулае. Мяркуючы па вершах на сацыяльна-гістарычную тэму, У. Дубоўка добра ўсвядоміў гэтую заканамернасць жыцця. І чытачы абавязкова зразумеюць, што ў залежнасці ад таго, як мы будзем адносіцца да мінулага, да традыцый, як будзем прыслухоўвацца да галасоў нашых продкаў, ад гэтага будзе залежаць наша будучыня.

Гісторыя дае нам трапныя адказы на многія пытанні, якія сёння ставіць час, хавае ў сабе шмат каштоўнасцей, вартых увагі. Наша задача заключаецца ў тым, каб не згубіць даўніны, а захаваць яе нашчадкам, узяўшы адтуль усё лепшае. Пра гэта думаў і У. Дубоўка.

Зварот аўтара да гістарычнай тэмы быў невыпадковым. У сваіх вершах паэт імкнуўся асэнсаваць мінулае, паказаць яго значнасць перад сучаснікамі. Пра гэта сведчаць такія яго вершы, як "Ты мне гаворыш", "Пачынаецца з гісторыі", "Ніколі не кленчы няволі", "Дзядоў і прадзедаў злілася сіла", "Ты дакляруеш мне долю і волю" і інш. Прааналізаваўшы гэтыя вершы, можна заўважыць у іх агульную танальнасць: беспраўе, пакуты, беднасць, незадаволенасць жыццём, бо "з Беларусі збіралі падаткі". Такі настрой пануе ў вершы "Ты мне гаворыш":

Беднасць пануе ў пясках і каменні,
стогне народ пад абцасам у пана?
І да святла ў нас не будзе імкненняў,
бо найгоршэйшае наканавана?

Годзе і годзе, таварыш пакорны!
Так жа было, але гэтак не будзе!
Нас недарэмна малолі ў жорнах, –
з кожнай пакруткай мацнелі ўсе людзі.

[5, с. 9].

Тут у цэнтры верша – лёс шматпакутнага народа, і для яго адлюстравання паэт знаходзіць вельмі яркія мастацкія дэталі. Ён паказвае людзей зняволеных, перадаючы поўны роспачы ўнутраны маналог пакрыўджаных і бяздольных, за якіх няма каму заступіцца ў тагачасным грамадстве, дзе ўсё прадаецца і купляецца, дзе ўлада на баку моцных. Пісьмо ў гэтым вершы падрабязнае ў дэталях і афарыстычнае, думка скандэнсавана, як бы сцягваецца ў асобныя сэнсавыя вузлы, у выразныя мастацкія вобразы-дэталі. Створаныя карціны набываюць тыпова-абагульнены характар, становяцца карцінамі паднявольнага жыцця ў цэлым, яго выразнымі сімваламі. Калі чытаеш страфы з верша пра беспраўе народа, на памяць прыходзяць радкі з многіх твораў Ф. Багушэвіча, і асабліва назва "Бог не роўна дзеле" з надзвычай адметна выражанай у ім сацыяльнай пазіцыяй, яркага, публіцыстычнага і вельмі канкрэтнага. Але, у адрозненне ад класіка беларускай літаратуры, У. Дубоўка падкрэслівае нязгасную надзею і вялікую веру народа ў лепшую будучыню, жаданне мець лепшую долю:

Выдзьме ўвесь попел, як ворага, вецер,
выжане рабскую кроў і пакору.
Зойме айчына пасад свой у свеце,
заўтра – не будзе падобна на ўчора.

Шчасце здабудуць мазольныя рукі,
шчасце мы створым сваімі рукамі.
Ведаць не будуць пра гора унукі,
што панавала адвеку над намі [5, с. 9].

У вершы выразна створаны вобраз народа-змагара, які не скарыўся пад ціскам паноў, а мацнеў "з кожнай пакруткай". Паэт верыў, "што прыйдзе наш час, веру – прыйдзе наш час!" [5, с. 8]. Аўтар сцвярджае, што беларускі народ аддана любіць сваю Бацькаўшчыну і ўпэўнены, што "зойме айчына пасад свой у свеце, заўтра – не будзе падобна на ўчора" [5, с. 9]. У. Дубоўка дае чытачу магчымасць адчуць і зразумець, у якім часе жылі нашы продкі і што вымушала іх ісці на барацьбу:

Успамінаць, можа, і не варта,
бо было аж за царскім рэжымам.
Але ў той час гэта былі не жарты
і Беларусь стаяла то ніцам, то дыбам.
Часінаю не хапала пакорнасці і цярплівасці.
Кроў пачынала віхурыць у жылах [5, с. 89].

Паэт у вершы "Не дзівіся", развіваючы думку з папярэдняга твора, сцвярджае: "Не дзівіся: ніколі на свеце без змагання жыццё не дынаміць", бо "жыццё ў змаганні, дык змаганне вітай істотай!" [5, с. 29]. Гэта сапраўды так. Наш народ ведаў, каб нешта змяніць да лепшага, патрэбна за гэта змагацца. Асабліва кранае верш "Ніколі не кленчы нядолі". Ён уражвае першымі радкамі, якімі ствараецца надзвычай яркі, адначасова канкрэтны і надзвычай абагульнены малюнак барацьбы. Паэт вельмі патрабавальны да сябе ў адносінах словаўжывання: кожнае слова, кожны троп дакладна характарызуе з'яву:

Даволі пакоры, даволі
качацца ў пылу на зямлі!
Са светлым і моцным жаданнем,
упарта, упэўнена, ў час,
спаткаем мы шчаснае Ранне,
яно падыходзіць да нас [5, с. 147].

Позірк у заўтра тым больш аб'ектыўны і праўдзівы, калі заснаваны на асэнсаванні мінулага. Высокаінтэлектуальная паэзія У. Дубоўкі ўважліва ўзіралася ў мінулае, каб вынесці з яго зерне новай гістарычнай праўды. І таму мінулае ў вершах "Пачынаецца з гісторыі", "Дзядоў і прадзедаў злілася сіла", "Ты дакляруеш мне долю і волю" і інш. – нязменны апанент сучаснасці. Яно пераклікаецца з сённяшнім днём, адцяняе, акрэслівае яго розныя бакі, працуе на яго. Сам пісьменнік ніколі не забываў, хто даў яму жыццё, далучыў да ведаў, даў уменне працаваць і навучыў быць настойлівым і мужным. За гэта ён удзячны сваім продкам:

Дзядоў і прадзедаў злілася сіла
у гэтых мускулах,
упартасці маёй.
Яна мяне ў жыцці маім вадзіла
на бітву
з найвялікшаю бядой.

Спыніць мяне
не здолела ніякая навала,
бо я –
працоўны,
гартаваны чалавек.
Але...
не меў я
з подласцю
ніколі згоды,
не навучыўся аніяк цярпець.
Удзячны продкам я сваім
за сілу,
якая
праз жыццё мяне вадзіла.
А за дадатак слабасці нязначны...
Таксама продкам я сваім
удзячны!

[5, с. 179–180].

У гэтых радках мы адчуваем непарыўную сувязь пакаленняў, сувязь на генетычным і духоўным узроўні. У. Дубоўка ўпэўнены ў тым, што такую сувязь патрэбна абавязкова зберагчы. Калі чытаеш гэты верш, ствараецца ўражанне, што напісаны ён у нашы дні: настолькі багаты твор на філасофскі падтэкст, так арганічна яднаецца ў ім канкрэтнае і агульнае, так непрыкметна перарастае аб'ектыўнае ў суб'ектыўнае. Па гэтым пытанні прыгадваюцца словы выдатнага знаўцы мастацтва М. Бахціна пра сапраўнае і ўяўнае, вечнае і кан'юнктурна-часовае ў літаратуры. Адказваючы на пытанне часопіса "Новый мир", ён адзначаў: "Творы разбураюць межы свайго часу, жывуць у стагоддзях, гэта значыць у вялікім часе, да таго ж часцей (а вялікія творы заўсёды) больш інтэнсіўным і поўным жыццём, чымсьці ў сваёй сучаснасці... Але твор не можа жыць у наступных стагоддзях, калі ён не ўвабраў у сябе неяк і мінулыя стагоддзі. Калі б ён нарадзіўся толькі ў суцэльна сёння (гэта значыць у сваёй сучаснасці), не працягваў бы мінулага і не быў бы з ім істотна звязаны, ён не мог бы жыць у будучыні. Усё, што належыць толькі цяперашняму, гіне разам з ім" [6, с. 331]. Гэта выказванне датычыцца і твораў У. Дубоўкі ў цэлым, якія перажылі свой час і таму, што не жылі толькі "сиюминутным" успрыманнем эпохі 20-х гадоў, а перараталі сваю эпоху, наслойваючы на яе мінулае і будучыню. Варта адзначыць і яшчэ адну асаблівасць лірычных твораў: яны медытатыўныя, роздумныя, стыхія лірычнага пачуцця падпарадкоўваецца ў іх напружанай філасофскай думцы. І ад гэтага становіцца прасцейшай кампазіцыя твора, выразным яго псіхалагічны малюнак, а само пісьмо больш афарыстычным, сціслым і адточаным. Пра гэта сведчаць некаторыя вершы паэта ("Далёкае мы любім надта", "Плач навальніцы", "На ўшанаванне новага падзелу беларускай зямлі" і інш.), у якіх аўтар адкрываў перад сабою свет не толькі стозвонны, шматгалосы, шматфарбны, але і шматмерны ў многіх аспектах.

Такім чынам, падсумоўваючы сказанае, можна зрабіць выснову: лірычныя творы У. Дубоўкі ілюструюць падзеі далёкага мінулага, акрэсліваюць цяжкае жыццё нашых продкаў, сцвярджаюць найвялікшую прагу да шчасця і свабоды для сябе і сваіх дзяцей, усхваляюць працоўнага чалавека, яго мужнасць, настойлівасць і цвёрдасць, нежаданне быць прыніжаным, прыгнечаным і пакрыўджаным. Мы бачым, што такі народ імпануе пісьменніку, які жадае яму лепшай долі, будучыні. Змест вершаў сведчыць пра глыбокія перажыванні паэта за сваю Радзіму, за лёс народа. Пачуцці У. Дубоўкі падпарадкаваны не эмоцыям, а цвярозым поглядам паэта на мінулае Беларусі. Аўтар паказвае праявы жыцця, у якіх найбольш поўна раскрываецца веліч нашага продка, цэласнасць і сіла яго духу і характару. Трэба адзначыць, што вершы У. Дубоўкі на сацыяльна-гістарычную тэматыку былі для паэта свайго роду подступам, тым будаўнічым матэрыялам, які ён пазней рэалізуе ў вершаваным эпасе.

У 20-х гадах XX стагоддзя паэту ўдалося стварыць два буйныя эпічныя творы, прысвечаныя мінуламу: "Крычаўская спакуса" (1925) – аб сялянскім паўстанні 1740–1744 гг. і драматычная паэма "Браніслава" (1929) – аб далёкіх часах прыгону. Дзве паэмы дыхалі змаганнем працоўных Заходняй Беларусі, якія ніколі не мірыліся з няволяй і не раз паўставалі на барацьбу супраць польскіх магнатаў і прыгнятальнікаў. Тут патрэбна зрабіць агаворку: тэма Заходняй Беларусі займае даволі прыкметнае месца ў творчай біяграфіі У. Дубоўкі. І гэта зразумела – там знаходзіўся родны бацькоўскі кут паэта, там ён правёў сваё маленства і юнацтва, з далёкімі роднымі мясцінамі звязаны думы і пачуцці паэта. Усведамленне гэтага цяжкага паднявольнага становішча Заходняй Беларусі, дзе нават "і песня не песня, а плач навальніцы", глыбока параніла сэрца паэта. Але ён бачыў, што і над гэтым "стружаным краем" "гарыць і палае пад ветрам паходня". І калі паэту гаварылі часамі, а то, можа, і ў сэрца яго самога закралася сумненне, што "долю і волю бачыць не суджана нашай айчыне", ён мужна перамагаў гэтыя хвілінныя настроі і горача пратэставаў. Як сведчанне гэтаму – паэмы У. Дубоўкі "Браніслава" і "Крычаўская спакуса". У першым творы сацыяльны пратэст беларускага народа супраць панства ўвасабляе ў сабе сялянская дзяўчына Браніслава, у другім – гэты пратэст выліваецца ў сапраўднае паўстанне, у якім бяруць удзел шырокія народныя масы.

На сённяшні дзень асаблівую цікавасць выклікае паэма "Крычаўская спакуса", якая доўгі час была забыта ў айчынным літаратуразнаўстве. Упершыню твор быў апублікаваны ў 1959 годзе, хаця напісана паэма была ў 1925 годзе. "Крычаўская спакуса" створана аўтарам на аснове невялікай паэмы "Грахі чубатыя" і вершаванай паэмы-легенды "Бра… гінь" (1924). Паэма "Крычаўская спакуса" прысвечана рэальным гістарычным падзеям на Беларусі – крычаўскаму паўстанню 1740–1744 гг. Яна звернута ў далёкае мінулае, да часоў прыгону. Аўтар паэмы акрэслівае яе жанравыя межы, называючы свой твор гістарычнай хронікай, і гэта, на наш погляд, у пэўнай ступені апраўдана, бо адчуваецца цесная сувязь аўтара з гістарычнымі дакументамі, веданне гераічнага мінулага. Аўтар узгадвае кіраўнікоў крычаўскага паўстання – Карпача, Вашчылу, Ветра. Як падкрэслівае Дз. Бугаёў, "У. Дубоўка быў дастаткова дасведчаны, каб з павагай гаварыць пра слаўныя старонкі нацыянальнай гісторыі" [7, с. 98]. Паэма напісана ў стылі класічнага народнага эпасу. Яе герой – народ, які ўзняўся на барацьбу

з польскімі феадаламі. Сама тэндэнцыя асэнсаваць гісторыю як рух да сучаснасці з'яўлялася, бясспрэчна, станоўчай, бо сведчыла пра здаровую духоўную патрэбу для грамадства. Бо без усведамлення гэтай сувязі не можа, па разуменні У. Дубоўкі, быць паўнацэннасці грамадзянскай свядомасці сучасніка.

У паэме "Крычаўская спакуса" пісьменнік на гістарычным фоне паказвае беларускага селяніна XVII–XVIII стагоддзяў, які рашуча ўзняўся супраць феадальнага прыгнёту. Вяршыняй руху з'яўлялася паўстанне крычаўскіх сялян пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы. І хаця паўстанне было жорстка падаўлена, яно расказала свету пра смелых крывічан, для якіх "лепей загінуць за шчасце аднойчы, чым да магілы пакутаваць з горам" [8, с. 185]. Народ спрадвеку імкнуўся да самастойнасці і незалежнасці як свайго жыцця, так і сваёй краіны. Пра гэта марыў і Дубоўка, услаўляючы ў паэме мужны і працавіты беларускі народ:

Сіла працоўная не памірае,
а памірае драпежнік пракляты.
Слаўныя дзеі твае не забыты,
як і сыны твае, горад-паўстанец [8, с. 177].

У самым пачатку паэмы аўтар засяроджвае ўвагу чытачоў на тым, што Крычаў не аднойчы пакутаваў ад варожых навал, але мужнасць яго жыхароў дапамагла выстаяць ва ўсіх складаных сітуацыях:

Колькі разоў цябе нішчылі, Крычаў,
не пакідалі на камні камень.
Вораг на тое ніяк не разлічваў,
што ты стаяў і стаяцьмеш вякамі [8, с. 177].

Прычынай да барацьбы супраць магната Радзівіла сталі невыносныя, незлічоныя пакуты, якія "народ працярпеў немавядома колькі". Паншчыну адбывалі мужчыны і жанчыны. Пачынаўся дзень паншчыны з узыходам сонца, заканчваўся, калі сонца заходзіла. Феадалы жорстка каралі сваіх падданых, калі тыя спазняліся ці не выходзілі на працу ў вызначаныя дні. У якіх умовах жылі ў той час людзі, паэт вельмі трапна гаворыць у наступных радках паэмы:

Людзі жылі, як гарох пры дарозе,
Людзі жылі ў штодзённай трывозе.
Людскога хлеба не бачылі людзі,
гора пілі ў страшэннай пакуце.
Польныя зёлкі, лясное карэнне
мелі яны для свайго спажыўлення.
Хлеб учынялі з трухлявага дуба,
абы як-небудзь пазбыцца ад згубы.
І напіліся тым горам дап'яна,
і закусілі тым хлебам трухляным [8, с. 178].

Адкуль столькі бед і нягод выпалі на долю беларускага народа? Чаму працавіты, сумленны чалавек быў пазбаўлены мець шчасце і волю? Гэтыя адвечныя пытанні ўзніклі не сёння, а шмат гадоў таму назад, на іх спрабавалі знайсці адказы і нашы далёкія продкі. Збавенне ад усіх бед яны чакалі ад Бога і спадзяваліся на яго. Ды толькі

і ў гэтым ім не шанцавала, бо "Бог для народа заўсёды далёкі, толькі багатым дае дапамогу" [8, с. 177]. У гэтых радках мы адчуваем матыў няроўнасці, якім пранізана ўся паэма.

Не знайшоўшы дапамогі ад Бога, народ звяртаецца да прыроды, з якой, дарэчы, заўсёды адчуваў сваю непарыўную сувязь. Гаворка ідзе ў паэме пра раку Сож:

Сож ты, мой Сож, паўнаводны які ты!
Колькі вады перагнаў ты да мора!
Бачыш ты ў небе высокім блакіты,
бачыш ты неба блакітнага зоры.
Крышыш ты камень магутнаю хваляй,
топіш на дно і пяском замываеш,
каб і не ведалі, каб і не зналі,
дзе яго сіла схавана цяжкая.
Што ж не скрышыў ты і панскую ўладу,
Што не ўтапіў ты на дно, як каменне,
гору цяжкому не даў ты прынаду
там, пад каменнем, пад самым струменнем? [8, с. 178].

Гэтым зваротам да прыроды аўтар хацеў сказаць, што панская ўлада – не рэч, ад якой можна лёгка пазбавіцца. А каб стаць сапраўды вольнымі, людзі павінны самастойна, сваімі рукамі перамагчы цяжар пакут. У. Дубоўка скіроўвае думкі чытача на тое, што чалавек зможа зрабіць усё, калі ён прагне шчасця, калі адчувае нянавісць да ворагаў і марыць пра светлую будучыню. Гістарычнае ў паэме падаецца высвечаным аўтарскім сумленным пачуццём, лірычным перажываннем. Менавіта ў падобным тыпе паэмы У. Дубоўка знайшоў найбольш адэкватныя і спрыяльныя магчымасці для паэтычнага ўвасаблення сваёй канцэпцыі рэчаіснасці. У. Дубоўка цудоўна выкарыстаў магчымасці гістарычнага матэрыялу. Перад тварам гісторыі як бы адыходзяць у бок дробязныя, прыватныя, выпадковыя думкі і эмоцыі. Унутраны свет аўтара ў гэтай паэме паўстаў сканцэнтраваным на самым істотным, у дадзеным выпадку – на паўстанцах. І таму яны так свабодна ўключаюцца ў вялікі свет сацыяльных страсцей і падзей. Таму лад думак, пачуццяў і інтарэсаў аўтара, яго прамыя ці ўскосныя адносіны да адлюстраванай падзеі надаюць паэме найбольшую жыццёвасць і эмацыянальнасць.

Народ жыве для праўды і ўсе яго дзеянні – змаганне за праўду. Але трэба пагадзіцца, што праўду здабываць вельмі цяжка, калі ў руках толькі косы ды сякеры. Тым не менш, гэта не спыніла паўстанцаў, а наадварот, надало ім сілы. Бо, як слушна піша Дубоўка, "сякеры за праўду стаялі". Супраць гармат і мячоў радзівілаўскага войска ўзброены паўстанцы былі вельмі прымітыўнай зброяй:

Несамавітая зброя, як быццам, –
косы, сякеры з гартаванай сталі.
Цяжка сякерам з гарматамі біцца,
але сякеры за праўду стаялі.
Іменем шчасця народа самога
білі сякеры ўсіх прыгнятых [8, с. 179].

Людзі шмат цярпелі прыніжэнняў, а цяпер вырашылі паказаць, на што здольны "цёмны, забіты горам беларускі селянін", калі вялікая крыўда і нянавісць зліліся і перапоўнілі яго душу. У ёй бурліла нянавісць да непасрэдных эксплуататараў, гатоўнасць разлічыцца за ўсе здзекі:

Многа маёнткаў было каля Сожа,
многа засценкаў і розных фальваркаў.
Спалены тыя, забралі з тых збожжа,
знішчылі князеву ўсю гаспадарку.
Гнёзды гандлярскія разам палалі,
борзда праводзіў агонь падрахункі.
А для жывых і няспаленых – Гдалій
у Радзівіла прасіў паратунку [8, с. 179–180].

Каб давесці пачатую справу да канца, паўстанцы вырашылі захапіць Крычаўскі замак, – тым самым здабыць свабоду. Гэта была іх свайго роду спакуса. І вось тады паны адчулі нават страх, бо ўбачылі тую магутную сілу, якая здольная супрацьстаяць ім, адчулі небяспеку адтуль, адкуль ніколі яе не чакалі. Народнае войска не разгубілася, не разбеглася ад радзівілаўскіх гармат, а наадварот, яно ўсё мацнела. Гэта быў перыяд інтэнсіўнага росту сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці народных мас Беларусі. Праз цэнтральныя сцэны ў паэме – апісанне штурму Крычаўскага замка – У. Дубоўка імкнуўся паказаць чытачу мужнасць, настойлівасць і смеласць простага народа, які "так, як жылі, і ваююць – папросту: косы, сякеры і куцыя доўбні" [8, с. 183]. Гэтымі словамі паэт дае нам магчымасць зразумець, што не так важна, якая зброя ў руках, важна тое, што жыве ў сэрцы і душы, з якімі думкамі і пачуццямі ты ідзеш на барацьбу. Як бачна, паны мелі моцную зброю, але гэта ім не дапамагло, бо змагаліся яны супраць дабрыні і чысціні, супраць сумленных працавітых людзей. І дабро, як бывае ў казках, перамагае:

Суд адбыўся кароткі і борзды:
"тое табе, што для нас ты настроіў…"
і апусцелі шляхецкія гнёзды
з гэных прысудаў народных герояў [8, с. 184–185].

Чатыры гады горад быў свабодны. Перавага крычаўскіх паўстанцаў, якія на працягу гэтых гадоў адбівалі шалёныя атакі шматлікіх радзівілаўскіх паноў, была не ў зброі, а ў іх праўдзе, у тым, што яны дзейнічалі "імем шчасця народа самога". І хаця праз некаторы час паўстанне захлынулася ў крыві, нягледзячы на паражэнне і цяжкія страты, прыгонныя не склалі зброі, не скарыліся. Паўстанцы рыхтаваліся да новых бітваў, веруючы ў сваю перамогу. Паўстанне "стала ўрокам мужнасці для народа і папярэджаннем рабаўнікам" [9, с. 175]. І гэты гераічны дух крычаўскіх падданых у справядлівай барацьбе супраць прыгнятальнікаў ужо ніхто не можа спыніць. Заканчваецца паэма публіцыстычнымі радкамі аб неўміручасці подзвігу: "Слаўныя дзеці твае не забыты, як і сыны твае, горад-паўстанец" [8, с. 187]. Гэтым прыкладам з гістарычнага мінулага паэт нібы хацеў падтрымаць дух сваіх сучаснікаў з Заходняй Беларусі ў іх справядлівай барацьбе з белапольскай навалай.

Чытаючы паэму "Крычаўская спакуса", мы добра разумеем смеласць У. Дубоўкі, бо яму патрэбна было пераадолець тыя спецыфічныя цяжкасці творчага парадку, якія ставіць перад пісьменнікам гістарычная тэма, тым больш, што сам аўтар быў зусім маладым паэтам, не меў дастатковага мастацкага вопыту ў асэнсаванні гістарычнага мінулага. Захапіўшыся мінулым, паэт не губляе сувязі з сучаснасцю. Аднак не ставіць гэтыя два часавыя вымярэнні побач, нават не супрацьпастаўляе іх у святле галоўнага грамадска-сацыяльнага канфлікту, як гэта рабілі ў свой час М. Чарот, А. Дудар, А. Александровіч. У. Дубоўка проста ацэньвае мінулае з пазіцый чалавека, які можа жыць у розныя часы, думка якога можа свабодна перамяшчацца ў часе і прасторы. І разам з тым не ў меншай ступені, чым лірычныя героі названых вышэй аўтараў, паэт разумее веліч мінулага і яго каштоўнасць у сучасным жыцці.

Зазначым, што У. Дубоўка ў паэме знаёміць нас толькі з трыма ўдзельнікамі крычаўскага паўстання, але не будзем забываць, што яны – частка народа, а значыць – "гэта ж народ узнімаўся нават, а не Карпач, не Вашчыла, не Вецер" [8, с. 187]. Поспех сустракае У. Дубоўку там, дзе ён пранікае ў дух гісторыі, адчувае каларыт часу, своеасаблівасць характараў – напрыклад, у эпізодзе расправы над ўдзельнікамі паўстання. Вельмі жорстка ўлады абышліся з тымі, хто сеяў спакусы, здабываў свабоду. Толькі "борзды Вашчыла ўцёк на Украіну". Але некаторыя архіўныя дакументы сведчаць, што Васіль Вашчыла быў затрыманы і дастаўлены "з усёй дакументацыяй у Кіеўскую губернскую канцылярыю" для разбіральніцтва, а "Ветра выкінулі з вежы на вострае колле", на "Карпача, у мядзвежую скуру зашыўшы, выпусцілі "зграю някормленых выжлаў" [8, с. 186]. Больш падрабязныя звесткі пра лёс Вашчылы, Ветра і Карпача можна знайсці ў працах В.І. Мялешкі, П.А. Лойкі [10–11]. Адзначым тую акалічнасць, што Вецер, Карпач і Вашчыла – сапраўдныя гістарычныя постаці, яны з'яўляліся кіраўнікамі крычаўскага паўстання. На іх прыкладзе аўтар ухваляе еднасць беларусаў, іх непахіснасць, мужнасць і нескаронасць духу. Звернем увагу на тое, што імя Вашчыла мы сустракаем не толькі ў паэме "Крычаўская спакуса". Згадаем верш "Пачынаецца з гісторыі", дзе гаворыцца, што "тады бралі сяляне ў рукі вілы і восці, і тады душыў паноў крычаўскі Вашчыла" [5, с. 89]. Гэтая гістарычная постаць прысутнічае і ў паэме "Грахі чубатыя". У творы прасочваецца матыў згубленай долі, бясконцых слёз на Беларусі. Вашчыла паўстае тут сапраўдным героем, памяць пра якога жыве, як і ён сам, "і ныне прысна". Бо ён жа сапраўдны герой народны, бо паходзіць з самой гушчы народа – з сялянства, якое найбліжэй да роднай зямлі. Зварот У. Дубоўкі да гістарычных асоб сведчыць пра тое, што аўтар рабіў смелыя прарывы ў праўду гісторыі, вёў спрэчку з антыгістарычнымі тэндэнцыямі.

Важнае месца займаюць у паэме масавыя сцэны – асада панскага палаца, расправа з панамі-прыгнятальнікамі. У. Дубоўка імкнецца перадаць каларыт часу ў апісаннях батальных сцэн, у характарыстыках адмоўных вобразаў – плебана, біскупа, розных старастаў і падпанкаў. Але трактоўка асобы героя-носьбіта сялянскага пратэсту ў Дубоўкі такая ж, як і ў іншых творах паэта таго часу.

Жадаючы даць дакладнае мастацкае ўвасабленне таго незвычайнага, што адбывалася ў гісторыі народа, паэт шукаў такія вобразныя сродкі, якія б адпавядалі гістарычным падзеям. Таму вельмі распаўсюджаныя былі сімволіка, алегорыя,

паэтычная ўмоўнасць – мастацкія прыёмы, характэрныя для рамантычнага стылю. Шмат у паэме "Крычаўская спакуса" выкарыстана эпітэтаў, параўнанняў, у прыватнасці: *гарацешны люд, чорная жальба, блюзнярская рука, збалелыя грудзі; жылі, як гарох пры дарозе, вогнішчы ходзяць, як самі сабою, драпежнік праклятьы, слаўныя дзеці* і інш. Мастацкія сродкі дапамагаюць чытачу ўявіць малюнак тагачаснага жыцця, адчуць цяжар пакут, якія былі ў мінулым жыцці, зразумець цяжкасці, што ляглі на плечы сялян. Цікавай аказалася сама структура паэмы, у якой мы назіраем паўтор паміж першай і заключнай часткамі твора. Вось гэтыя радкі:

Колькі разоў цябе нішчылі, Крычаў,
не пакідалі на каменні камень.
Вораг на тое ніяк не разлічваў,
што ты стаяў і стаяцьмеш вякамі [8, с. 177; 187].

Выкарыстанне такога роду прыёма робіцца аўтарам свядома з мэтай узмацнення галоўнай ідэі паэмы, дзе сцвярджаецца думка, што сапраўдная сіла, якая стаіць за праўду, за народнае шчасце, ніколі не дазволіць ворагам дашчэнту знішчаць родны край, народны дух. І мы зноў адчуваем услаўленне і гонар аўтара за беларусаў.

Нельга не адзначыць у паэме плённае выкарыстанне аўтарам дыялогаў і маналогаў. Варта адзначыць, што пісьменнік добра валодае майстэрствам дыялога, што павялічвае эфект драматычнага дзеяння. Аўтар выкарыстоўвае напружанасць дыялогавай формы з мэтай раскрыцця маральнай пазіцыі герояў, іх учынкаў. Паэму "Крычаўская спакуса" з упэўненасцю можна назваць драматычным творам. Праўдзіва раскрыўшы праблемы тагачаснай рэчаіснасці, У. Дубоўка стварыў драматычныя характары, дакладна абазначыў канфлікт, умела пабудаваў эмацыянальныя маналогі і дыялогі.

У дыялогах аўтар выкарыстоўвае пытальныя і клічныя формы сказаў, эмацыянальныя словы, што дазваляе паказаць свае адносіны да тагачасных падзей, трымаць чытачоў у напружанасці думкі:

Першы гайдук

Пане Стаху! Пане Ежы!
Гвалт, ды які!
Каля нашай белай вежы
грамадой стаяць
мужыкі!

Пан Стах

Мужыкі стаяць ля вежы?
Грамадой?

Староста

Што за ліха? Як ты смееш,
хам,
супярэчыць?

А навошта ж бізуны вам,
а навошта ж мечы?
Прэч! Каб духу іх не стала,
гэных псоў.
Хіба вас па зборні мала,
гультаёў?
-----------------------------------
Зброю мне!
І меч дамаскі!
Пазнаёмім з панскай ласкай! [8, с. 181–183].

Праз мастацка-выяўленчыя сродкі і прыёмы складваецца канчатковы малюнак паўстання, становяцца зразумелымі ўсе маральныя пазіцыі герояў, іх учынкі, выразна бачыцца і пазіцыя самога паэта.

Нельга абмінуць увагай і назву паэмы. "Крычаўская спакуса" – сімвалічная назва: адчуўшы подых сапраўднай свабоды, простыя жыхары горада Крычыва смела абараняюць здабытае права "звацца людзьмі". Спакуса – тое, што вельмі вабіла, прыцягвала жыхароў, выклікала жаданне ўладарыць. Крычаўская зямля спрадвеку належала беларусам, але ж і паны таксама хацелі мець яе пры сабе. Як падкрэсліваецца ў гістарычнай навуцы, іх імкненнем "было стаць гаспадарамі ў Крычаўскім старостве, панамі над прыгоннымі ў гэтым уладанні. Гэта значыць, што на сялянскім кані шляхціцы хацелі ўз'ехаць на кіраўніцтва над сялянамі ў адным з буйнейшых уладанняў на беларускіх землях у тыя часы" [10, с. 58]. Можна меркаваць, што спакуса ў паэме ўвасабляе не толькі Крычаў, але і ўсю Беларусь, якая славілася прыгажосцю, нацыянальнымі каштоўнасцямі і мужнымі, працавітымі людзьмі. Несумненна, што ўладарыць такім багаццем было за гонар для любой дзяржавы. Але ж беларусы сваёй зямлі ворагу не аддалі, не здрадзілі яны і сваёй Радзіме. У. Дубоўка заўсёды верыў у тое, што народ абавязкова павінен быць шчаслівым і вольным, каб радавацца жыццю і славіць свой край.

Паэма "Крычаўская спакуса" – не толькі мастацкі твор, але і добры матэрыял для вывучэння нацыянальнай гісторыі, бо ў яго аснову ляглі сапраўдныя падзеі мінулага. Да таго ж, паэма не толькі зместам, але і ўсім эмацыянальным ладам адлюстроўвае мэтанакіраванасць народа ў будучыню. Твор добра перадае псіхалогію адзінага парывання, імкнення, агульнай згуртаванасці. У ёй аўтар шырока выкарыстоўвае тыя магчымасці, якія характэрны для жанру паэмы, яе сінтэтычны характар.

Як бачым, творы У. Дубоўкі на сацыяльна-гістарычную тэматыку маюць цесную сувязь між сабой. У іх мы можам знайсці агульны матыў, адных герояў, якія складаюць сілу адзінства пакрыўджанага народа.

Паэтычная творчасць У. Дубоўкі вабіла да сябе сваімі свежымі для беларускай паэзіі матывамі, сваёю шчырасцю і арыгінальнасцю. Яна сапраўды была наватарскай. У творах паэта адчуваўся не толькі глыбокі талент, але і новая адметная паэтычная культура. Будуць да месца словы, сказаныя М. Багдановічам у артыкуле "Забыты шлях", дзе аўтар пісаў: "Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён (маецца

на ўвазе У. Дубоўка – Х.Г.) мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы” [12, с. 288]. Так, У. Дубоўка меў чулую творчую душу, палымянае сэрца. Ён, як ніхто іншы з пісьменнікаў свайго часу, глыбока разумеў душу свайго народа, цаніў яго мінулае, плённа звяртаючыся да яго ў сваіх вершах і паэмах. У. Дубоўка – адзін з тых, для каго гісторыя з’яўляецца прыкладам гераізму, трываласці і настойлівасці мастака, тым, пра што павінен памятаць кожны, хто жыве пад мірным небам. Забываць гісторыю нельга, бо забыўшы яе, мы не зможам знайсці ўсе вартасці і каштоўнасці ў сучасным жыцці. А гісторыя ва ўяўленні паэта – гэта жыццё, поўнае адданасці свайму народу: працавітасць, настойлівасць, прага да волі і шчасця, бессмяротная надзея на светлую будучыню, імкненне захаваць прыгажосць беларускай зямлі, якую пакінулі нашы продкі. Л. Смальянава мае рацыю, калі піша: “Сёння вельмі важна асэнсаваць гісторыю свайго народа як частку гісторыі чалавецтва, узняць праблемы агульнанароднага быцця да праблем агульначалавечых” [13, с. 135]. Жыццёвая аснова ў творах паэта канкрэтная, тыпізаваная, гістарычны матэрыял прапушчаны праз сэрца і розум паэта, прасякнуты глыбокім лірычным перажываннем.

Завяршаючы гаворку пра У. Дубоўку і яго паэзію, хочацца нагадаць словы М. Арочкі, які пісаў: “У. Дубоўка адышоў ад нас пад покрыў нябыту. Але яго блакітнае вока чарадзейніка-мастака не змогуць засыпаць халодны жвір і попел небыцця. Яно будзе яснець для нас вялікай мудрасцю і хараством жыцця” [14, с. 503]. З гэтым нельга не пагадзіцца. Сапраўды, нам застаецца толькі падзякаваць вялікаму майстру за тое, што ён быў, што сеяў зерне беларускага духу, абуджаў нацыянальную самасвядомасць.

## Літаратура

1. Бярозкін, Р. Паэзія – маё жыццё / Р. Бярозкін. – Мн., 1989.
2. Пісьменнікі БССР аб рэформе правапісу беларускай мовы. – Мн., 1934.
3. Багдановіч, І. “На дзіды сэрца накалю” / І. Багдановіч // Полымя. – 2000. – № 4.
4. Бугаёў, Д. Талент і праца / Д. Бугаёў. – Мн., 1979.
5. Дубоўка, У. О Беларусь, мая шыпшына / У. Дубоўка. – Мн., 2002.
6. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М., 1979.
7. Бугаёў, Д. Уладзімір Дубоўка / Д. Бугаёў. – Мн., 2005.
8. Дубоўка, У. Выбраныя творы / У. Дубоўка. – Мн., 1959.
9. Мішчанчук, М. Літаратура, народжаная Кастрычнікам / М. Мішчанчук. – Мн., 1983.
10. Мялешка, В.І. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы / В.І. Мялешка, П.А. Лойка. – Мн., 1998.
11. Мялешка, В.І. І ўзняўся люд просты / В.І. Мялешка, П.А. Лойка. – Мн., 1992.
12. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мн., 1993. – Т. 2.
13. Смальянава, Л.П. Шляхі паэтычнага эпасу / Л.П. Смальянава. – Мн., 1977.
14. Арочка, М. Уладзімір Дубоўка / М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры. – Мн., 1999. – Т. 2.

*Паступіла 30.08.2007*